ПРАЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

# ВІЦЕБСКІ ПРАЛЕТАРЫ

Орган гаркому КП(б)Б, гарсавету і гарпрафсавету.

№ 26 | СЕРАДА, 1 ЛЮТАГА 1933 г. | № 26

## АБ НОРМАХ ЗДАЧЫ ДЗЯРЖАВЕ ЗБОЖЖА УРАДЖАЮ 1933 г. ПА АСОБНЫХ КУЛЬТУРАХ.

У пастанове ад 27 студзеня г. г (у адпаведнасьці з пастановай СНК СССР і ЦК УсеКП(б) ад 19 I 1933 г.) Савет Працы і Абароны ўстанавіў сярэднія па рэспубліках, краёх і абласьцях нормы здачы калгасамі збожжа дзяржаве з ураджаю 1933 году па асобных культурах з разьліку на кожны гектар устаноўленага плянам пасеву яравых і на кожны гектар фактычнага пасеву азімых. Сярэднія нормы здачы збожжа для Беларусі вызначаны:

Калгасы, абслугоўваемыя МТС, здаюць: пшаніцы—0,5 цэнтн., жыта—0,5, аўсу—0,8 і бабовых культур 0,4 цэнтн. з гектара.

Калгасы, не абслугоўваемыя МТС, здаюць: пшаніцы—0,6 цэнтн., жыта—0,7, аўсу—1,1 і бабовых культур - 0,5 цэнтн. з гектара.

Даручана СНК саюзных рэспублік, краявым і абласным выканкомам устанавіць і, з зацьверджаньня СНК СССР, апублікаваць нормы здачы пшаніцы, жыта, аўса і бабовых для кожнага раёну з тым, каб была забясьпечана, як поўнае выкананьне ўстаноўленых для рэспублікі, краю і вобласьці разьмераў здачы ўсіх збожжавых хлябоў у цэлым, так і кожнай з наступных культур: пшаніцы, жыта аўсу і бабовых. Параённыя нормы здачы пшаніцы, жыта, аўсу і бабовых, роўна як і сярэднія па ўсіх збожжавых культурах нормы, устаноўленыя СНК саюзных рэспублік краявымі і абласнымі выканкомамі вьяўляюцца абавязковымі для ўсіх калгасаў даннага раёну і ня могуць падлягаць зьмене.

Аднасобныя гаспадаркі абавязаны здаваць дзяржаве пералічаныя вышэй культуры ў разьмерах абавязацельстваў, устаноўленых для кожнай аднаасобнай гаспадаркі сельсаветамі, выходзячы з фактычна засеянай плошчы азімых і зацьверджанага пляну севу яравых культур з тым, каб здачы з гектара пшаніцы, жыта, аўсу і бабовых аднаасобнымі гаспадаркамі была на 5—10 проц. вышэй нормы, устаноўленай для калгасаў даннага раёну.

## За сталінскі стыль у рабоце нізавога друку і рабсельваенкораў.

17 лістапада мінулага году 127 перадавых рабсельваенкораў у сваёй адозьве да ўсіх рабсельваенкораў Віцебшчыны пісалі: „праз паўтары месяцы—новая вялікая гістарычная дата—1-е студзеня 1933 году, калі наша краіна ўступіць у другую вялікую пяцігодку—пяцігодку набудовы сацыялізму... Мы ўносім прапанову сьціць з 20 лістапада па 1 студзеня паход нізавога друку і рабсельваенкораў „За сацыялістычны ўклад у фонд другой пяцігодкі“.

Гэты заклік перадавікоў быў падхоплены рабсельваенкорамі раду прадпрыемстваў і вайсковых часьцей.

Бюро гаркому партыі ў сваёй пастанове ад 17 лістапада 1932 г. адзначыла, што паход „павінен даць новы ўздым энтузыязму рабочых і калгасьнікаў на пасьпяховае завяршэньне народна-гаспадарчага пляну 1932 году“.

Сёньня мы падводзім вынікі гэтага саракадзённага масавага паходу.

Бясспрэчна, што там, дзе паход быў ператвораны ў справу ўсёй партарганізацыі, усёй пралетарскай грамадзкасьці, там, як вынік, мы маем рад дасягненьняў, дзякуючы палепшаньню работы нізавога друку і рабселькораўскага руху.

Асаблівыя ўзоры ў барацьбе „За сацыялістычны ўклад у другую пяцігодку“ паказалі насьценгазэты „Сьцягавец“—закройнага цэху фабрыкі імя Лекерта, „За шпаркія тэмпы“—зборачнага цэху акулярнай фабрыкі і шматтыражка „Артылерыст“—Н-скага артпалка.

Рэдкалегіі і рабкоры гэтых газэт, пад непасрэдным кіраўніцтвам сваіх партыйных арганізацый, правялі вялікую работу па ажыцьцяўленьні асноўных умоў паходу.

Каштоўнае ў рабоце гэтых газэт і рабкораў заключаецца ў тым, што яны здолелі скарыстаць нізавы друк і творчую ініцыятыву рабсельваенкораў на пасьпяховае выкананьне прамфінпляну, баявой і палітычнай падрыхтоўкі чырвонаармейцаў.

Даны складанейшы і адказьнейшы этап нашага сацыялістычнага будаўніцтва, як ніколі, патрабуе ўзьняцьця бальшавіцкай баяздольнасьці і аперацыйнасьці ў рабоце нізавога друку і рабселькораўскага руху. Зараз ужо нельга працаваць тэмпамі і мэтадамі мінулых год Сталінскі стыль у рабоце—вось што зараз больш чым калі-небудзь патрэбна нашаму друку. Гэта добра зразумелі насьценгазэты «Сьцягавец», «За шпаркія тэмпы» і шматтыражка „Артылерыст“. І таму ў трэцяе мэтаду іх работы мы маем—сацыялістычны рахунак, шэфства над парай абутку, буксір швейных істужак, сыстэматычную барацьбу з прагуламі, уцягненьне ў работу газэты ўсёй пралетарскай грамадзкасьці, праяўленьне раду іншых ініцыятыўных мерапрыемстваў. Рабсельваенкоры гэтых газэт добра ўцямілі асноўны лёзунг нашага рабселькораўскага руху «кожны рабсельваенкор—ударнік, кожны ўдарнік—рабсельваенкор» і таму яны былі і зараз знаходзяцца ва ўдарнай калёне перадавых. Т.т. Эйнгін (рэдактар «Сьцягаўца»), Пудавік (рэдактар „За шпаркія тэмпы“), Гарбуноў (ваенкор-арганізатар Н-скага артпалку—шматтыражка „Артылерыст“)—перадавікі перадавікоў.

Паход „За сацыялістычны ўклад у другую пяцігодку“ ўзьняў творчую актыўнасьць рабочых і работніц зборачнага цэху акулярнай і закройнага цэху фабрыкі імя Лекерта ў барацьбе за пасьпяховае выкананьне прамфінпляну ў гэтых цэхах.

Нядрэнна разгортвалася работа і на скурзаводзе, фабрыцы „Дзьвіна“, Н артпалку. На гэтых прадпрыемствах мы маем у выніку паходу рост гаспадарча-разрахунковых брыгад, замацаваньне рабочых да канца другой пяцігодкі, унясеньне рацыяналізатарскіх прапаноў, выкананьне фінпляну.

Паход узьняў баяздольнасьць нізавога друку на радзе прадпрыемстваў.

Але мы сёньня ня можам сказаць, каб у нас усё было добра ў галіне работы нізавога друку на ўсіх нашых прадпрыемствах. Яшчэ дрэнна працуе нізавы друк (дэхавы, брыгадны) на фабрыцы „Дзьвіна“, „Сьцягу індустрыялізацыі“, фабрыцы імя КІМ і інш. Гэта тлумачыцца тым, што партарганізацыі гэтых прадпрыемстваў нездавальняюча кіруюць нізавым друкам і рабкораўскім рухам.

Зусім дрэнна абстаіць справа з насьценным друкам і селькораўскім рухам у калгасах і саўгасах. У большасьці калгасаў і саўгасаў насьценгазэты ня выходзяць, у радзе выходзяць з вялікімі перабоямі, пры гэтым якасьць работы выходзячых газэт застаўляе жадаць шмат лепшага. І гэта таму, што рад вясковых парт'ячэек ня кіруюць нізавым друкам. Трэба цьвёрда памятаць паказаньні ЦО нашай партыі «Правды»: „Або мы кіруем газэтай, і тады яна выконвае пастаўленыя партыяй задачы, або мы ёю ня кіруем і тады яе скарыстоўвае ў сваіх клясавых інтарэсах супроць нас кулак“.

„Кожная насьценная газэта павінна быць забясьпечана моцным партыйным кіраўніцтвам“. Гэтае паказаньне ЦК КП(б)Б павінна быць выканана кожнай партыйнай ячэйкай прадпрыемства, саўгасу, калгасу. Баявым правядзеньнем адзінага партдню аб друку даб'ёмся рашаючага пералому.

Сапраўды вялізарныя задачы паўстаюць перад нашым нізавым друкам і рабселькораўскім рухам у сувязі з гістарычнымі рашэньнямі пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б) і паказаньнямі тав. Сталіна.

„Галоўны ўпор павінен быць зроблены не на колькасны рост прадукцыі, а на палепшаньне якасьці прадукцыі і рост вытворчасьці працы ў прамысловасьці, не на пашырэньне пасеўных плошчаў, а на рост ураджайнасьці ў земляробстве і палепшаньне якасьці работы ў сельскай гаспадарцы“ (з рэзалюцыі пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б).

Баявая і адказьнейшая задача нашага нізавога друку зараз у тым, каб яшчэ больш узмацніць клясавую пільнасьць, бо „рэвалюцыйная пільнасьць зьяўляецца той самай якасьцю, якая асабліва неабходна цяпер бальшавікам“ (І. Сталін). Вастрыё нізавога друку і рабселькораўскага руху—гэтаймацнейшай зброі нашай партыі павінна быць накіравана супроць усіх шкоднікаў, жулікаў, вароў, апартуністаў, клясавых ворагаў, усіх тых, якія тармозяць нашу работу на сацыялістычным будаўніцтве, пазбаўляючы буржуазных элементаў з радоў нашай партыі, прыкрываючыся партбілетам, бязьлітасна змагаючыся з усімі, якія прыкрываюцца фальшывым нацыянальным сьцягам.

Асабліва адказныя задачы ўскладаюцца на наш вясковы нізавы друк. «Цяпер задача саставіць у тым, каб узмацніць калгасы арганізацыйна, вышыбіць адтуль шкодніцкія элемэнты, падабраць сапраўдныя праверэныя бальшавіцкія кадры для калгасаў і зрабіць калгасы сапраўды бальшавіцкімі»—гэта сталінскае паказаньне—баявая праграма работы нізавога друку ў вёсцы.

Праводзімы 3 лютага агульнагарадзкі зьлёт рабсельваенкораў Віцебску павінен будзе стаць пераломным у справе далейшага ўмацаваньня нізавога друку, павышэньні яго баяздольнасьці ў барацьбе за генэральную лінію партыі, у пераняцьці вопыту перадавых.

Сёньня зьмяшчаемымі карэспандэнцыямі перадавых мы адкрываем кнігу складчыны перадавога вопыту.

Краіна напярэдадні слаўнай 15-ай гадавіны сваёй гераічнай рабоча-сялянскай Чырвонай арміі. Мы сёньня пачынаем варашылаўскую эстафэту. Баявая задача нізавога друку і рабсельваенкораў—адразу-ж пераключыцца ў варашылаўскую эстафэту, у яе баявыя маршруты.

За новыя перамогі ў рабоце нізавога друку!

ЗАГАТОЎКІ МАЛАКОПРАДУКТАЎ.

## Сваечасова і поўнасьцю будзе выкананы плян па малаку толькі ў тым выпадку, калі ня будуць паўтораны памылкі і недахопы па хлебазагатоўках.

### Віноўнікаў зрыву загатовак малакопрадуктаў—да адказнасьці.

Выкананьне пляну загатовак малакопрадуктаў па раёне ідзе надзвычайна марудна. Месячны плян на 25-е студзеня выкананы толькі на 31,1 процанта. Асабліва недапушчальна адстаюць: Рудакоўскі сельсавет, які выканаў плян на 25 студзеня толькі на 14,4 проц., Ялагінскі—14,7 проц., Шумнянскі—12,3 проц., Віцебскі—24 проц., В. Лётчанскі—25 проц., Бабініцкі—29 проц.

У глыбокім тыле загатовак знаходзіцца аднаасобны сэктар, які выканаў плян на 15 проц. Па цьвёрдаму заданьню здано толькі 25 проц.

Мы зьмяшчалі матар'ял аб тым, што вурокі хлебазагатовак павінны былі ўлічыцца ў загатоўках малака. Сельсаветы, загаткантора і сельСТ па мясцох загатоўкі малакопрадуктаў не арганізавалі, пусьцілі на самацёк. Т. Сталін у сваім дакладзе на аб'яднаным пленуме ЦК і ЦКК УсеКП(б) сказаў, што «самацёк на даным этапе самы небясьпечны, самацёк можа нагубіць усю справу». Гэтага не даацянілі сельсаветы і каапэрацыйна-загатоўчыя арганізацыі і на справе атрымалася, што плян сарваны.

Дрэнна і вельмі дрэнна ідзе загатоўка масла. Згодна пастановы гарсавету, загатоўкі масла павінны вытвараць Машканскі, Старасельскі, Мікалаёўскі і Замастоцкі сельсаветы. На 25-е студзеня плян па масьле выкананы толькі на 26 проц. Гэта сьведчыць аб поўнай бязьдзейнасьці сельсаветаў і сельСТ у гэтай справе.

Сэкратарыят гарсавету, які адбыўся днямі, прапанаваў пад адказнасьць тав. Разумоўскага забясьпечыць у пяцідзённы тэрмін поўнае выкананьне студзеньскага пляну загатовак малака і масла, прыняўшы самыя рашучыя меры да спагнаньня заданьняў з кулацка заможных гаспадарак і аднаасобнага сэктару, да невыканаўцаў прымаць самыя рашучыя меры ўзьдзейнічаньня—накладаньне штрафаў і аддачу пад суд.

[illegible] і [illegible]СТ абвяшчаны зараз-жа ўвагца за справу загатовак малакопрадуктаў, забясьпечыць поўнае выкананьне пляну, прыняць усе меры да выяўленьня нялічча малочнай тары з мэтай рацыянальнага яе скарыстоўваньня.

Белкаапмалако, пад асабістую адказнасьць тав. Лазоўскага, прапанавана гарсаветам забясьпечыць бесьперабойную прыёмку малака па ўсіх пунктах гораду, арганізаваўшы работу на сваіх пунктах так, каб яны служылі ўзорным прыкладам работы. Разам з гэтым Белкаапмалако павінна забясьпечыць праверку і арганізацыю работы па сельсаветах шляхам пасылкі сваіх работнікаў у сельсаветы.

Сельсаветы і сельСТ абавязаны пільна сачыць за тым, каб не разбазарвалася малако, бо ўжо наглядаюцца выпадкі, што калгасы прадаюць масла і малако на старану, у той час, як плян загатовак ня выкананы. Такія-ж выпадкі маюцца і з боку старшынь сельСТ. Гарсавет папярэдзіў усе сельСТ, што адгрузка малака і масла вытвараецца толькі па нарадах Белкаапмалако.

За бязьдзейнасьць у загатоўках малака райспажыўсаюз абвясьціў суровую вымову старшыні Шумнянскага сельсавету Казачэнка, папярэдзіў старшынь Замастоцкага, Бабініцкага, Рудакоўскага, Машканскага сельсаветаў, што ў выпадку незабясьпечаньня імі выкананьня загатовак малака, яны будуць прыцягнуты да судовай адказнасьці.

Сельсаветы, актыў, дэпутацкія групы, пад кіраўніцтвам партыйных ячэек, зараз-жа павінны арганізаваць загатоўкі малака, забясьпечыць бесьперабойнае паступленьне малака ад кожнага калгасу, калгасьніка, працоўнага аднаасобніка. З усёй сілай ударыць па сабатажніках загатовак і прымусіць іх поўнасьцю выканаць дадзены ім плян. Работнікі сельСТ павінны стаць сапраўднымі арганізатарамі за[illegible]. Толькі тады, калі загатоўкі малака будуць арганізаваны, калі будзе масавая работа пастаўлена на належную вышыню, калі будуць [illegible] на кулацка-заможныя гаспадаркі—плян загатовак малакопрадуктаў будзе з посьпехам выкананы.

### Жорстка караць разбазарваючых малако.

Цьвёрдазаданьнікі Рудніцкага сельсавету, да гэтага часу ня здалі ніводнага літру малака, ня здалі ніводнага літра і працоўныя аднаасобнікі пунктаў Войкава, Аржалова і Войлева. Члены сельсавету гэтых пунктаў Тузенкоў, Рыжкоў і Нікіцін нічога ня робяць па загатоўках малака. Сельсавет гэтаму сабатажу патурае сваёй бязьдзейнасьцю. Не здае малако і калгас імя Войкава. Старшыня калгасу Рыжкоў па пленуме сельсавету заявіў: «малака няма і ня будзем здаваць». На справе-ж малако ёсьць, каровы ацяліліся, але яго разбазарваюць, разьмяркоўваюць сярод калгасьнікаў. Такое-ж разбазарваньне маецца і ў калгасе імя Мархлеўскага.

Партыйная ячэйка і сельсавет абавязаны зараз-жа арганізаваць загатоўкі малакопрадуктаў, моцна ўдарыць па сабатажніках і спажывецкіх тэндэнцыях у калгасах, прымусіць іх неадкладна выканаць студзеньскі плян.

Посьпех у загатоўках малака будзе дасягнуты толькі тады, калі будзе зломлены кулацкі сабатаж, калі будзе забясьпечана масавая работа сярод калгасьнікаў і працоўных аднаасобнікаў, калі будуць загатоўкі арганізаваны.

Селькор.

### Арганізаваць загатоўкі малакопрадуктаў.

В.-Лётчанскі сельсавет. (Па тэлефоне ад нашага спэцкора).

Загатоўкі малакопрадуктаў па В.-Лётчанскаму сельсавету знаходзяцца ў пагражаючым становішчы. Першы этап здачы поўнасьцю праваленны па аднаасобнаму сэктару, а цьвёрдазаданьнікі ня выканалі і 10 процантаў пляну.

Віцебскае сельСТ, на абавязку якога ляжыць непасрэднае кіраўніцтва па гэтай справе—бязьдзейнічае. Працаўнікі сельСТ Гальбрай і спэцыяльны малакавед Старыковіч гастралюць па сельсавеце, не праводзячы ніякай масавай работы па пунктах і ў вёсках. Яны ня ведаюць сапраўднага становішча справы. Назіраліся факты, калі на зьлёўны пункт калгасу «Заходняя Дзьвіна» прывозілася аднаасобнікамі малако і накіроўвалі назад з-за адсутнасьці тары.

У сельсавеце маецца 5 загадчыкаў крам, якія цэлымі днямі нічога ня робяць, а гэты актыў можа праўленьне сельСТ скарыстаць для фарсаваньня здачы малака, для сумеснай работы з членамі сельсавету.

Прэзыдыум сельсавету павінен зрабіць рашучы нажым на кулацка-заможную частку, сабатуючую загатоўкі малака.

Р.

### Пусьцілі справу загатовак малака на самацёк.

Замастоцкі сельсавет мае ўсе магчымасьці для пасьпяховага выкананьня загатовак малакопрадуктаў. Але нягледзячы на гэта плян на 25 студзеня выкананы толькі на 30,3 проц.

Старшыні калгасаў упаўнівалі сельсавет і партыйную ячэйку, што пляны зусім невялікія, што яны будуць выкананы да тэрміну. Але-ж на справе аказалася зусім другое. Калгасы: «Чырвоная зорка», «Скрыдлёва», «Вусьце», «Чырвоны араты», «Зарыбінкі» і «Уперад» амаль лічы не прыступілі да здачы малака дзяржаве.

Маючыяся ва тэрыторыі сельсавету 130 аднаасобных гаспадарак зусім не здаюць малака. Асаблівы сабатаж у здачы малака дзяржаве праяўляе Гуліцін Ільля—былы страж, маючы карову на 2 душы, ён ня зьбіраецца здаваць малако дзяржаве. Старшыня сельсавету Колатаў нягледзячы на тое, што здача малака набывае сілу падатку, ніякіх захадаў ня прымае да яўных сабатажнікаў.

Па сутнасьці справы загатоўкі малакопрадуктаў па Замастоцкаму сельсавету пушчаны на самацёк, адсутнічае якая-б ні была барацьба за сваечасовае выкананьне пляну. Старшыня сельСТ Гарэлік, замест бальшавіцкай барацьбы за загатоўкі малака, да гэтага часу ня скончыў арганізацыю зьлёўных пунктаў, не забясьпечыў усе пункты тарай. Ён тлумачыць гэта адсутнасьцю тары, у той час, як па шмат якіх калгасах („Скрыдлёва“ і „В. Чэрніца) бітоны стаяць нескарыстанымі.

Брыгадзір „В. П.“ Расіін.

ЗА ВАРАШЫЛАЎСКІ ЎКЛАД У АШЧАДКАСУ.

## Пазыкатрымацель, укладчык ашчадкасы! Патрабуй ад ашчадкасы, свайго заводакіраўніцтва і фабкому добрага абслугоўваньня.

### Дню пазыкатрымацеля—баявую падрыхтоўку.

З 5 па 20 лютага па Беларусі праводзіцца дзень пазыкатрымацеля. Задача гэтага дню заключаецца ў тым, каб мабілізаваць працоўныя масы гораду і вёскі і асабліва апараты фінорганаў на лепшую пастаноўку абслугоўваньня пазыкатрымацеля.

Ашчадкасы Віцебску ўключыліся ў падрыхтоўку да правядзеньня дню пазыкатрымацеля. Па ўсіх ашчадкасах прадпрыемстваў разасланы спэцыяльна інструкцыйныя лістоўкі аб парадку правядзеньня дню пазыкатрымацеля. Рад ашчадных кас пры прадпрыемствах („Сьцяг індустрыялізацыі“, „Прафінтэрн“, імя Клары Цэткін) разгортваюць масавую работу па падрыхтоўцы да дню пазыкатрымацеля. Па цэхах разгорнута масавая праверка выйгрышаў папярэдніх пазык, раздачы замацавальных талёнаў, сваечасовае ўнясеньне грошай за пазыку, ахоп новых рабочых падпіскай на пазыку і тых, якія яшчэ не падпісаліся.

Задача фінорганаў, ашчадных кас, задача партыйных арганізацый, прафсаюзаў і камсамолу неадкладна ўключыцца ў падрыхтоўку да дню пазыкатрымацеля і весьці яе пад лёзунгам варашылаўскай фінансавай эстафэты. Да дню пазыкатрымацеля кожнае прадпрыемства, установа, калгас і сельсавет павінны ахапіць падпіскай на пазыку ўсіх рабочых, служачых, калгасьнікаў і працоўных аднаасобнікаў. Толькі поўнае выкананьне пляну па рэалізацыі пазыкі, па ўкладах у ашчадную касу і мабілізацыі сродкаў будзе паказчык добрага правядзеньня дню пазыкатрымацеля.

### ПРЫКЛАД ДОБРАЙ ПАДРЫХТОЎКІ.

Добра разгарнула падрыхтоўчую работу да дню пазыкатрымацеля ашчадная каса пры панчошнай фабрыцы імя Клары Цэткін. Праведзены гутаркі па цэхах аб значэньні дню пазыкатрымацеля, якія цесна ўвязваюцца з варашылаўскай фінансавай эстафэтай.

Кожны рабочы выпісаў нумары сваіх аблігацый па роду пазык і здаў гэты сьпіс у ашчадную касу для праверкі выйгрышаў. Ашчадная каса, праверыўшы выйгрыш, паведамляе рабочаму. Гэта ўжо зьяўляецца палепшаньнем абслугоўваньня пазыкатрымацеля. Рабочыя фабрыкі вельмі задаволены такім мэтадам абслугоўваньня.

Кожная ашчадкаса пры прадпрыемстве павінна падхапіць гэты пачын і праводзіць яго ў жыцьцё.

Лысенка.

### ЗЛАЧЫННА ПАРУШАЮЦЬ ФІНАНСАВУЮ ДЫСЦЫПЛІНУ.

16 лістапада 1932 г. канторай леспрамгасу Лосьвіда было ўтрымана ад рабочых-падпісчыкаў на пазыку „4-ы, завяршальны“ 409 руб. 50 к. Грошы-ж за пазыку і па сёмнаццаты дзень не пераведзены ў ашчадную касу.

Дырэктар леспрамгасу Лабуцкі і бухгальтэр Златкоўскі, нягледзячы на неаднаразовыя патрабаваньні ашчадкасы аб пераводзе грошай за пазыку, увесь час трымаюць гэтыя грошы ў сябе на прадпрыемстве.

Пракуратура за злачыннае парушэньне фінансавай дысцыпліны Лабуцкага і Златкоўскага павінна прыцягнуць да суровай адказнасьці. Грошы за пазыку павінны быць пераведзены безадкладна.

Старагойтаў.

### ПЛЯН ПЕРШАГА КВАРТАЛУ ПА ЎКЛАДАХ У АШЧАДКАСУ ВЫКАНАЛІ.

Дзякуючы штодзённай масавай работы сярод калгасьнікаў і рабочых біафабрыкі, ашчадная каса Даўжанскага сельсавету плян першага кварталу па ўкладах у ашчадкасу ў суме 7000 рублёў 29 студзеня выканала на 100 проц.

Перамога заваявана пад непасрэдным кіраўніцтвам партыйных ячэек, пры штодзённай рабоце з укладчыкамі ў ашчадкасу і пазыкатрымацелямі. Зараз пераключаем усе сілы на падтрыманьне ініцыятывы 5-й істужкі імя Парыскай камуны фабрыкі «Сьцяг індустрыялізацыі» па арганізацыі варашылаўскага ўкладу.

Г. Сурганаў.

### УКЛАД У АШЧАДКАСУ СКЛАДАЕ 14950.

Рабочыя ўпюжнага цэху фабрыкі «Сьцяг індустрыялізацыі» унесьлі ў ашчадную касу 3530 рублёў, пінжачнага «А»—3255 руб., бухгальтэры—900 руб., Швэйзбыту—350 руб., сартыровачнага—155 руб., тэхчасткі—985 р., паліто 1—2 група—1485 руб, 3—4 група—4290 руб., закройны — 900 руб., бручны—870 руб., бручны «А» — 520 руб., пінжачны «Б»—710 р. Усяго па фабрыцы на 31 студзеня ўкладзена ў ашчадкасу 14.950 руб.

Задача партыйнай арганізацыі, камсамолу, прафсаюзаў і асабліва камісіі садзейнічаньня—яшчэ больш пашырыць масавую работу і забясьпечыць 100 процантнае ўцягненьне рабочых у рады ўкладчыкаў ашчадкасы.

Матро.

## ЛІКВІДАЦЫЯ КОНТРРЭВАЛЮЦЫЙНАЙ ТРАЦКІСЦКАЙ ГРУПЫ Ў ГЕРМАНІІ.

БЭРЛІН. Пастойлівая прынцыповая барацьба германскай кампартыі, узмацнёўшаяся асабліва за апошнія месяцы, супроць трацкізму, прывяла да распаду невялікай трацкісцкай групы, што існавала ў Германіі Штотыднёвік германскіх трацкістаў «Пэрманэнтэ рэвалюцыён» у апошнім нумары абвяшчае аб ліквідацыі германскай трацкісцкай групы.

«Пэрманэнтэ рэвалюцыён» паведамляе, што большасьць арганізацыі адраклася ад Троцкага, выкрыўшы яго ў якасьці паклёпніка на Камуністычны Інтэрнацыянал, Савецкі саюз і, перш за ўсё, на т. Сталіна, і безагаворачна выказалася за лінію Камінтэрну, УсеКП(б) і КНГ.

«Пэрманэнтэ рэвалюцыён» публікуе на 1-й старонцы зваротбольшасьці трацкісцкай апазыцыі ў Германіі, у якім, між іншым, гаворыцца: «Большасьць левай апазыцыі заяўляе, што яна цалкам палітычна і арганізацыйна парывае з трацкісцкім рухам. Прагнозы Троцкага ў адносіне разьвіцьця Савецкага саюзу і Германіі абанкруціліся. Трацкісцкай апазыцыі ў Германіі прыходзіць канец. Ад імя большасьці гэтай арганізацыі мы абвяшчаем аб яе ліквідацыі... Пасьля таго, як Троцкі, наўпрэкі нашым папярэджаньням, выкарыстоўваў зьяўленьне кніжкі амэрыканскага дробнага буржуа, ворага Савецкага саюзу і камуністаў — Кемпбэла, чаша нашага цярпеньня пераапоўнілася... Гэты адзін факт меў дастатковае значэньне, каб цалкам апраўдаць разрыў з Троцкім... Няма ніводнай праблемы міжнароднага руху, у якой трацкісцкія ацэнкі не аказаліся б фальшывымі. Далоў антыпартыйныя групы і групоўкі (Брандлер, Урбан г. д.)!

Няхай жыве Камінтэрн, камуністычная партыя Савецкага саюзу і кампартыя Германіі!

У тэзісах большасьці трацкісцкай арганізацыі, у якіх выражаны адносіны большасьці да праблемы міжнароднага руху, зьмешчана, у прыватнасьці, заява: „за ўсёй гісторыі фракцыйнай барацьбы ўнутры і па-за Камуністычнага Інтэрнацыяналу—правым, аказаўся Камуністычны Інтэрнацыянал. Ня можа быць месца ўнутры Камуністычнага Інтэрнацыяналу для якіх-небудзь іншых груп, якія, нібы, хочуць змагацца на глебе рэвалюцыйнай клясавай барацьбы“.

У тым-жа нумары «Пэрманэнтэ рэвалюцыён» зьмешчаны заявы рэдакцыі лістка саксонскай арганізацыі трацкістаў «Ротэр кур'ер», а таксама большасьці рэдакцыі «Пэрманэнтэ рэвалюцыён». У гэтых заявах указваецца, што рэдакцыі гэтых органаў стаяць на пазыцыі большасьці, г. зн. выступаюць за ліквідацыю трацкісцкіх груп. Адначасова «Пэрманэнтэ рэвалюцыён» публікуе паведамленьне рэдакцыі «Октобэр брыфэ», лістка трацкістаў унутры «Сацыялісьціше арбэйтэр партэй» (партыя „Зэйдэвіца-Розэнфэльда“) аб тым, што выданьне «Октобэр брыфэ» спыняецца.

# ПАХОД ЗАКОНЧАН. Творчую актыўнасьць рабсельваенкораў і бальшавіцкую апэрацыйнасьць нізавога друку пераключаем у баявую эстафэту ў гонар гераічнай рабоча-сялянскай і Наркома КЛІМА ВАРАШЫЛАВА.

## РАШЭНЬНІ ГІСТАРЫЧНАГА ПЛЕНУМУ ЦК І ЦКК, ПАКАЗАНЬНІ тав. СТАЛІНА—БАЯВЫ ЗАГАД УСЯМУ ДРУКУ—МАЦНЕЙШАЙ ЗБРОІ ПАРТЫІ, УСІМ РАБСЕЛЬВАЕНКОРАМ—„КАМАНДЗІРАМ ПРАЛЕТАРСКАЙ ГРАМАДЗКАЙ ДУМКІ“.

### РАБКОРЫ АКУЛЯРНАЙ ФАБРЫКІ ПРАПАНУЮЦЬ

## абвясьціць варашылаўскую эстафэту рабсельваенкораў.

*ЛІСТ ДА РЭДАКЦЫІ „ВІЦЕБСКАГА ПРАЛЕТАРА“, ДА УСІХ ШМАТТЫРАЖАК, НАСЬЦЕНГАЗЭТ, РАБКОРАЎ, СЕЛЬКОРАЎ І ВАЕНКОРАЎ ВІЦЕБШЧЫНЫ.*

На агульнафабрычным сваім зьлёце мы, рабкоры акулярнай фабрыкі імя Розы Люксэмбург, падвялі вынікі паходу «За сацыялістычны ўклад у другую пяцігодку», пачаты па ініцыятыве «127».

Дзякуючы кіраўніцтву партыйнай арганізацыі фабрыкі паходам, удзелу ў ім рабочых мас і разгорнутай рабоце нізавога друку фабрыкі, яго ўзмацненьня, мы дабіліся наступных посьпехаў.

❋ Выкананьне прамфінпляну па фабрыцы з 72,62 проц. у лістападзе ўзьнялося ў першай дэкадзе сьнежня да 89,47, у другой дэкадзе 95,15 проц., 5-й пяцідзёнцы сьнежня 111,5 і апошняй пяцідзёнцы 138,3 проц.

❋ За гэты час колькасьць гаспадарча-разрахунковых брыгад вырасла з 8 да 11, лік ударнікаў—з 390 да 412; замацавалася да канца другой пяцігодкі 350 рабочых.

❋ За час паходу мы сабралі 52 рабочых прапановы, з якіх ужо ажыцьцяўлёна 6, з эфэктыўнасьцю ў 3122 рублі.

❋ Адным з вузкіх месц у палітычна-масавай рабоце на фабрыцы была напработа. Мы паставілі перад сабой задачу ліквідаваць прарыў на гэтым вучастку. З гэтай мэтай арганізавалі і правялі агульнафабрычны зьлёт рабочых нацыянальных меншасьцяй (палякаў, латышоў, яўрэяў). Зьлёт прайшоў з вялікім уздымам і зьявіўся моцным вагаром у справе ўзьняцьця ажыцьцяўленьня нацпалітыкі партыі на належную вышыню. Арганізаваны і працуюць палітгурткі на польскай, яўрэйскай і латыскай мовах.

❋ Нізавы друк на фабрыцы ўзьняў сваю баяздольнасьць і апэрацыйнасьць. Да паходу на фабрыцы выходзіла 4 цэхавых і 2 брыгадных насьценгазэты, у час паходу і зараз—5 цэхавых і 5 брыгадных насьценгазэт. Лік рабкораў-ударнікаў узьняўся з 37 да 107.

❋ Нізавы друк мабілізуе рабочых на барацьбу з прагуламі, з разбазарваньнем цэнтралізаваных фондаў снабжэньня за выяўленьне клясава-варожых элемэнтаў, пралезшых на фабрыку.

Асабліва вялікую работу правяла штодзённая насьценгазэта зборачнага цэху «За шпаркія тэмпы», дзякуючы чаму цэх заняў па выкананьні прамфінпляну першае месца на фабрыцы і прамяіваны трыкутнікам фабрыкі пераходным сьцягам і бюстам т. Сталіна. У цэху ўзорна пастаўлена палітычна-масавая работа. Усе работніцы цэху падпісаліся на пазыку «4-ты, завяршальны», ахоплены калектыўным страхаваньнем, наведваюць палітшколы і гурткі, усе сходы, выпісваюць і чытаюць газэты.

Усе нашы дасягненьні за час паходу—ёсьць вынік бальшавіцкага апэрацыйнага кіраўніцтва і сыстэматычнай дапамогі з боку рэдакцыі «Віцебскага пралетара» і парткалектыву фабрыкі і нашай упартай барацьбы за 6 гістарычных паказаньняў тав. Сталіна.

Мы ўступілі ў другую пяцігодку—пяцігодку пабудовы бясклясавага грамадзтва, унёсшы свой рабкораўскі ўклад у фонд яе.

Мы завяршылі паход у той час, калі партыя на сваім гістарычным студзеньскім пленуме ЦК і ЦКК УсеКП(б) падвяла вынікі ажыцьцяўленьня першай пяцігодкі і разглядзела народна-гаспадарчы плян першага году другой пяцігодкі. Даклад правадыра нашай партыі і сусьветнага пралетарыяту тав Сталіна на пленуме, яго прамова аб рабоце ў вёсцы—наша баявая праграма барацьбы за вяршыні прамфінпляну першага году другой пяцігодкі, баявая праграма нашай работы па ўзмацненьні пралетарскага шэфства над вёскай, па умацаваньні абароназдольнасьці нашай краіны.

23-га лютага мы будзем сьвяткаваць вялічайшую гістарычную дату Кастрычніка—пятнаццацігодзьдзе нашай гераічнай і слаўнай Чырвонай арміі.

Уся краіна рыхтуецца да гэтай слаўнай гадавіны.

Мы, рабкоры-ўдарнікі акулярнай, у адзнаку гэтай гадавіны, абвяшчаем у сябе варашылаўскую эстафэту і заклікаем усіх рабсельваенкораў Віцебшчыны правесьці варашылаўскую эстафэту па ўсяму нашаму раёну.

❋ Мы ставім перад сабой задачу актыўна змагацца за поўнае выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну па ўсіх яго паказчыках, асабліва па якасьці, памятаючы, што выкананьне прамфінпляну—аснова асноў узмацненьня абароназдольнасьці нашай пралетарскай краіны.

❋ Мы абавязуемся правесьці работу па 100-процантным ахопе ўсіх работніц і рабочых членствам Асоавіахэму, арганізаваць гурткі: вайскова стралковы, хэмічны, першай дапамогі і наладзіць сатаварыства са сваёй падшэфнай вайсковай часьцю, поўнасьцю рэалізаваць дадзенае нам заданьне на білеты 7-ай лётарэі Асоавіахэму.

❋ Замацоўваючы маючыяся дасягненьні па нацрабоце, бярэм на сябе абавязак правесьці ў першых лічбах лютага «інтэрнацыянальны кангрэс», адначасова наладзіўшы рабкораўскую сувязь з рабкорамі замежных краін.

❋ Поўнасьцю замацоўваючы маючыяся дасягненьні ў рабоце нізавога друку і рабсельскораўскага руху на фабрыцы, мы, ажыцьцяўляючы гістарычныя рашэньні аб'яднанага пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б), паказаньні нашага правадыра і настаўніка т. Сталіна, будзем упарта змагацца за прамфінплян, такім чынам узмацняючы абароназдольнасьць нашай краіны.

Мы добра ведаем, што ў сувязі з рашэньнямі гістарычнага пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б) нашы задачы, як рабкораў-ударнікаў ускладняюцца і становяцца яшчэ больш адказнымі.

Калектыўныя рабкоры «Віцебскага пралетара»: шматтыражка «Чырвоная акулярніца».

Штодзённыя цэхавыя і брыгадныя насьценгазэты акулярнай фабрыкі: „За шпаркія тэмпы“, „За якасьць“, „На варце“, „Даёш плян“, „Штурмоўка“, „6 умоў т. Сталіна“.

АД РЭДАКЦЫІ „В. П.“. Штаб паходу „За сацуклад у другую пяцігодку“ прыняў прапанову рабкораў акулярнай і пастанавіў *завяршэньне паходу ператварыць у пачатак варашылаўскай эстафэты.*

## ПЕРАЙМАЙЦЕ ВОПЫТ БАЯВОЙ ШТОДЗЁНКІ, НАРОДЖАНАЙ РАБСЕЛЬВАЕНКОРАЎСКІМ ПАХОДАМ.

*Ліст рабкораў зборачнага цэху акулярнай.*

Ганебна работаў наш цэх напярэдадні абвяшчэньня паходу „За сацуклад у другую пяцігодку“. Ён быў самым адстаючым на фабрыцы. За лістапад плян быў выкананы толькі на 91,8 проц.

Чаму гэта было так? Вельмі проста. Дзённа была пастаўлена ў цэху палітычна-масавая і грамадзкая работа. У цэху была толькі адна гаспадарча-разрахунковая брыгада, але і яна работала ўсьляпую, бо ня быў наладжаны вучот яе эфэктыўнасьці. Толькі на паперы існавалі добраахвотныя грамадзкія арганізацыі. Большая частка работніц не была ахоплена вучобай.

У завяршэньне трэба сказаць, што насьцен газэта цэху работала дрэнна. У цэху было шмат прагулаў работніц. Наша газэта ня мела права рашуча абрушвацца на прагульшчыкаў, бо яна сама была прагульшчыцай. На допісы, якія зьмяшчаліся ў цэхавай газэце, амаль-што не рэагавалі. Гэта прывяло да таго, што зацікаўленасьць газэты ў работніц адпала і як вынік гэтага апошнія тры тыдні да паходу газэта зусім ня выходзіла.

Так работаць далей было нельга. «Наш цэх мае ўсе магчымасьці ісьці ўперад»—так рашылі работніцы.

Пачалі з таго, што пераабралі склад рэдкалегіі „За шпаркія тэмпы“. У новы склад рэдкалегіі ўвайшлі лепшыя ударніцы. т. т: Пудавік, Бялая, Эпштэйн, Артабалеўская, Крылова і інш; усяго 11 асоб.

Рабкоры-ўдарніцы „За шпаркія тэмпы“ насьценгазэты зборачнага цэху акулярнай фабрыкі.

17 лістапада мінулага году мы прачлі адозву 127 перадавых рабсельваенкораў Віцебшчыны, заклікаўшых у паход па сустрэчы другой пяцігодкі. Работніцы цэху ўсе ўключыліся ў паход.

21 лістапада выпускаецца першы нумар «За шпаркія тэмпы» новым складам рэдкалегіі. З гэтага дню наша сьцянгоўка ня ведае прагулаў, яна выходзіць штодзённа.

У першых-жа нумарох газэты мы паказалі лепшых ударніц цэху, ганьбавалі недысцыплінаваных і тых, хто зрываў прамфінплян.

Праз газэту было арганізавана спаборніцтва паміж асобнымі ўдарніцамі, давядзеньне прамфінпляну да кожнай работніцы, да кожнага вучастку, арганізацыя новых гаспадарча-разрахунковых брыгад. Адной уноў арганізаванай брыгадзе мы далі імя другой пяцігодкі. Мы падхлёстваілі тэхчастку на старонках нашай газэты, і такім чынам, дабіліся вучоту эфэктыўнасьці брыгады.

Брыгада імя 15-годзьдзя Кастрычніка атрымлівала ад падрыхтоўчага цэху шарніры дрэннай якасьці. Праз газэту мы прад'явілі падрыхтоўчаму сацыялістычны рахунак. Рахунак наш яны прынялі і шарніры пачалі паступаць лепшай якасьці.

У падрыхтоўчым цэху дрэнна работала насьценгазэта. Мы накіравалі туды буксір з двух таварышоў, якія дапамаглі наладзіць там работу.

Дрэнна ў нас у цэху ажыцьцяўлялася ленінская нацпалітыка. Не вялося ніякай работы сярод нацменаў. Мы рашылі і пры дапамозе фабкому і «Чырвонай акулярніцы»—нашай шматтыражкі правялі зьлёт нацменаў цэху і фабрыкі. Да зьлёту мы выпусьцілі „За шпаркія тэмпы“ з артыкуламі на беларускай, польскай, яўрэйскай і латыскай мовах.

Толькі паявілася ў друку пастанова ЦВК і СНК аб звальненьні за прагул, мы адразу-ж праз газэту давялі гэтую пастанову да кожнай работніцы паасобку, шырока абгаварылі пастанову ў брыгадах і на цэхавым сходзе і абрушыліся з усёй бальшавіцкай ярасьцю на прагульшчыц цэху, на ўсіх парушыцеляў працдысцыпліны.

У адказ на пастанову ЦВК 90 работніц цэху замацавалі'ся да канца другой пяцігодкі. Зараз у цэху няма прагулаў і спазьненьняў на работу.

Мы стварылі брыгаду з рабкораў па праверцы таго, як правільна выдаюцца ў нас наборныя дакуманты. Брыгада выявіла, што ў работніцы Радчанка на ўтрыманьні лічыўся яе сын, які адначасова работаючы на фабрыцы «Сьцяг індустрыялізацыі», атрымоўваў там наборныя дакуманты.

Работніца—камсамолка Маеўская ў цэху разважала: «Хто будзе працаваць у вёсцы, калі ўсіх кулакоў павыслалі», гаворыла яна языком кулака. Мы праз газэту разаблачылі гэту контррэвалюцыйную вылазку клясавага ворага. Работніцы, у выніку гэтага, узьчялі рэвалюцыйную пільнасьць, даючы бязьлітасны адпор праз газэту і ў гутарках усялякім клясава-варожым разважаньням.

Мы ахапілі ўсіх работніц рознымі відамі вучобы.

Вялікіх дасягненьняў мы дабіліся ў фінрабоце Усе работніцы цэху ахоплены казыкай, 60 работніц ахоплены калектыўным страхаваньнем. Усе работніцы падпісаліся на білеты 7-й лётарэі Асоавіахэму. Запраектавана было, што наш цэх дасьць у ашчадкасу 250 руб., мы далі 528. У цэху няма запазычанасьці па членскіх узносах.

Па ініцыятыве газэты на фабрыцы арганізавана каса ўзаемадапамогі, якой ахоплена 75 работніц нашага цэху.

Справаздачна-перавыбарчая кампанія нізавых прафарганізацый не застала нас урасплох. З нумару ў нумар мы мабілізоўвалі увагу работніц да кампаніі. 90 работніц цэху ўдзельнічалі у самаправерачных брыгадах і як вынік нашай упартай работы наш цэх першым закончыў кампанію. У новы склад цэхкому абрана 5 лепшых ударніц цэху, у тым ліку і рэдактар «За шпаркія тэмпы» тав. Пудавік.

Нару слоў як мы работаем:

Уся рэдкалегія разьбіта па двойках, кожная двойка плюс рэдактар газэты (які ўдзельнічаў у рабоце штодзённа) выпускае газэту адзін раз у пяцідзёнку. Мы прымаем ня толькі пісьмовы, але і вусны матар'ял.

У рэдкалегіі ёсьць адказны таварыш, які сачыць за рэагаваньнем на зьмешчаны матар'ял у газэце.

Ва ўсёй нашай рабоце мы цесна зьвязаны з цэхавай партыйнай ячэйкай і цэхкомам, а таксама адміністрацыяй цэху. Партыйная ячэйка штодзённа займаецца і кіруе нашай газэтай.

Вынікі нашай работы кажуць самі за сябе.

У лістападзе выкананьне прамфінпляну было на 91,68 проц. За першую дэкаду сьнежня выкананьне раўнялася 138 проц. і апошняя пяцідзёнка (напярэдадні фінішу паходу) дала лічбу 153. Цэх ідзе ўперадзе ўсёй фабрыкі, за што прэміяваны фабрычным сьцягам трыкутніка.

Мы ўнесьлі свой уклад у другую пяцігодку.

Партыя і краіна падвялі вынікі першай пяцігодкі. Гістарычныя рашэньні пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б)—вось баявая праграма нашай далейшай работы.

Мы, рабкоры зборачнага цэху акулярнай фабрыкі, на чале з сваёй насьценгазэтай «За шпаркія тэмпы» даём слова партыйнай арганізацыі фабрыкі, даём слова рэдакцыі „Віцебскага пралетара“, што не пакладаючы рук будзем і надалей работаць, яшчэ вышэй узьнімаючы баяздольнасьць нашага друку—гэтай мацнейшай зброі партыі, накіроўваючы яго вастрыё супроць усіх тых, якія шкодзяць нашай сацыялістычнай будоўлі.

Рабкоры-ўдарніцы зборачнага цэху акулярнай фабрыкі падпісваюцца на самалёт „Рабселькор-ударнік Віцебшчыны“.

Таварышы рабсельваенкоры Віцебшчыны! Прыходзьце да нас азнаёмлівацца з вопытам нашай работы і пераймайце яго для таго, каб ва ўсіх цэхах, ва ўсіх калгасах, вайсковых часьцях па-баявому работаў наш насьценны друк.

Рэдактар насьценгазэты зборачнага цэху акулярнай фабрыкі «За шпаркія тэмпы» Пудавік.

Члены рэдкалегіі—работніцы-ўдарніцы: Бялая, Артабалеўская, Эпштэйн, Крылова, Славіна, Зякан.

Сэкратар цэхавай ячэйкі КП(б)Б Салаўёва.

Старшыня цэхкому Ладысава.

## Ліквідавалі прарыў у сваім цэху, арганізавалі буксір швэйных істужак.

*Калектыўны ліст рэдкалегіі газэты „Сьцягавец“.*

Друк і рабкоры закройнага цэху фабрыкі імя Лекерта за баявую апэрацыйнасьць і мабілізацыю рабочай масы на выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну атрымалі ў час сталінскага паходу (май 1932 году) пераходны сьцяг газэты «Віцебскі пралетары».

Але ў апошнім квартале 4-га, завяршаючага закройны цэх меў шмат прарываў па ўсіх галінах сваёй работы.

Так, у кастрычніку цэх даваў замест 1850 плянавых толькі 1390—1500 пар крою. Амаль такое-ж становішча было ў цэху і ў лістападзе, калі мы давалі ня больш 1600 пар у дзень.

Па сутнасьці ў гэты час наш цэх і яго насьценгазэта «Сьцягавец» страцілі права на далейшае трыманьне сьцягу «Віцебскага пралетара».

І адозва перадавых рабсельваенкораў зьявілася тым вагаром, які ўзварушыў увесь рабкораўскі актыў закройнага цэху зьмены № 1.

«Сьцяга не аддамо нікому»—так рашылі рабкоры-закройшчыкі.

І гэтыя словы адразу-ж сталі падмацоўвацца справай.

Наша рэдкалегія «Сьцягавец» на другі-ж дзень пасьля абвяшчэньня сараканзённага паходу «За сацуклад у другую пяцігодку» пачынае разгортваць работу.

Члены рэдкалегіі і рабкоры разьбіліся на асобных галінах работы. Пачалі штурмаваць прарыў у прамфінпляне і першая дэкада сьнежня дае ўжо значны эрэх і прамфінплян пачынае выконвацца да 1885 пар у дзень і нават больш; другая дэкада ўжо дае лічбу 1900 і потым штодзённа плян выконваецца да 1900—2000 пар.

Але толькі колькаснае выкананьне прамфінпляну нас не задавальняе. Мы адстаем у якасных паказчыках. Нізкагатунковасьць закройнага цэху—гэта значыць выпуск дрэннага абутку, другога—трэцяга гатунку; асабліва дае шмат браку працэс брусоўкі. І мы шукаем, як лепш паставіць працу брусоўкі, як дабіцца зьніжэньня браку.

Уносіцца праз нашу ШТОДЗЁННУЮ насьценгазэту прапанова аб стварэньні пасьля працэсу «брусоўкі» кантролю. Такім чынам, брак па гэтаму працэсу зьведзены да нуля.

Наш цэх ва ўдарнай калёне ўсёй фабрыкі, якая ганебна адстае ў выкананьні прамфінпляну. Паверхнія цэхі свайго пляну ня выконваюць.

Наша рэдкалегія «Сьцягавец» пачынае задумвацца над тым, як дапамагчы ліквідаваць прарыў на асабліва адстаючых швэйных істужках. Зноў на старонках «Сьцягаўца» рабкораўская прапанова—стварыць на швэйных істужках трэцюю зьмену з закройшчыкаў па ліквідацыі прарыву з тым, каб даць магчымасьць бесьперапынна працаваць закройнаму цэху, у якога за гэты перыяд сабралася 25 000 пар крою, ляжачага мёртвым капіталам.

На заклік «Сьцягаўца» адгукнуліся перадавікі закройшчыкі і фабрыка пачала працаваць трэцюю зьмену.

Закройшчыкі, захопленыя думкай ліквідаваць прарыў, пусьцілі у рух 25000 пар крою, паказалі баявыя тэмпы работы, нягледзячы на тое, што яны ўжо доўгі час не працавалі на машынах.

Кожны дзень ударная брыгада па ліквідацыі прарыву падлічвала вынікі сваёй работы, абменьвалася вопытам, змагалася за тое, каб наступны дзень даў яшчэ больш лепшыя паказчыкі па выкананьні пляну і якасьці.

Два тыдні ўдарнай працы і 25000 пар крою пушчаны ў ход.

Працуючы на швэйных істужках, мы, рабкоры, вывучалі мэтады работы, вывучалі чаму на швэйных істужках маецца прарыў, чаму шмат нізкагатунковасьці.



Вышаў нумар „Сьцягаўца“, прысьвечаны ўзяцьцю шэфства над парай абутку.

Як працяг барацьбы за ліквідацыю прарыву на фабрыцы, «Сьцягавец» бярэ шэфства над парай абутку і праводзіць рэйд па якасьці. Гэтыя мерапрыемствы выклікалі шмат рабочых прапаноў па палепшаньні працы таго альбо іншага працэсу.

Зробленая дошка браку ясна гаварыла кожнаму рабочаму, што толькі ад яго самаго залежыць якасьць работы.

Рэдкалегія насьценгазэты «Сьцягавец» закройнага цэху фабрыкі імя Лекерта абмяркоўвае пытаньне буксіру швэйных істужак.

Шмат дасталося аддзелу тэхнічнага кантролю. „Сьцягавец“ дабіўся зьмены кіраўніцтва, замены паасобных прыёмшчыкаў.

—„Сьцягавец“ ніводнай мінуты ня сьпіняе барацьбы за выкананьне прамфінпляну, за выкананьне якасных паказчыкаў.

Гэтай барацьбой за прамфінплян ён заваяваў сабе аўтарытэт сярод усіх рабочых цэху і нават фабрыкі.

Наш «Сьцягавец» і мы, яго рабкоры, зорка сачым за выкананьнем вытворчых плянаў, не адстаючы ў мабілізацыі мас па ажыцьцяўленьні важнейшых гаспадарча-палітычных мерапрыемстваў партыі і ўраду.

Пастанова ЦВК і СНК аб барацьбе з прагуламі знайшла канкрэтнае праламленьне ва ўсёй нашай рабоце. „Сьцягавец“ ставіць пытаньне перад адміністрацыяй жорстка выконваць гэтую пастанову. Усякі выпадак спазьненьня на работу жорстка бічуецца.

Пастанова верасьнёўскага пленуму ЦК УсеКП(б) аб шырспажыве для «Сьцягаўца» і яго рабкораў—баявы загад і „Сьцягавец“ сваю работу пераносіць у цэх шырспажыву фабрыкі, дзе на першых парах праца была пастаўлена вусім дрэнна; ня было адпаведнай колькасьці рабочай сілы і належнага абсталяваньня.

„Сьцягавец“ у цэху шырспажыву ставіць сваёй задачай дабіцца ўзорнай работы гэтага цэху.

Зараз гэты цэх забясьпечаны рабсілай, забясьпечаны і абсталяваньнем. На сваіх старонках „Сьцягавец“ ведзе вялікую палітыка-выхаваўчую работу.

Усе рабочыя ў цэху ахоплены падпіскай на пазыку. Усе партыйцы, камсамольцы і пагул рабочыя ахоплены вучобай. Зараз усе рабочыя калектыўна застрахаваны.

Вопыт сваёй работы наш „Сьцягавец“ пераносіць і ў другія цэхі. Вось вінтавы цэх зьмены № 2—тут нізавы друк у загоне. Дзякуючы прынятым мерам з боку рэдкалегіі „Сьцягавец“ у цэху абіраецца новая рэдкалегія і газэта ў вінтавым пачынае штодзённа працаваць.

За час паходу наш «Сьцягавец» сабраў 10 прапаноў, з якіх 7 ужо ажыцьцяўлены.

Мы зразумелі вялікую палітычную ролю справаздачна-перавыбарчай кампаніі ФЗМК і наш «Сьцягавец» яе ўзначаліў.

Зьмена № 1 закройнага цэху ўдарна і ўзорна закончыла справаздачна перавыбарчую кампанію. Зараз мы, рабкоры, на чале с. „Сьцягаўцам“, працягваем работу і арганізуем масы рабочых на праверку працы агульнафабрычнага камітэту, на лепшы збор прапаноў, на лепшае складаньне наказу новаму складу фабкому.

Наша газэта ня ведае прагулаў. Яна выходзіць штодзённа.

У цэху каля 75 проц. рабочых—яўрэі. Наша рэдкалегія нясупынна змагаецца за пераход усёй работы па цэху на яўрэйскую мову. Мы ўжо дабіліся перамогі—у некаторых брыгадах культмасавую работу праводзяць на роднай мове.

Мы—рабкоры-ударнікі. Мы хварэем за ўсе недахопы вытворчасьці, мы хварэем за працу нашай штодзённі.

Рэдкалегія насьценгазеты «Сьцягавец»—Эцінген, Малкін, Морген, Фрайфэльд, Каршакоў, Слуцкі.

**АГУЛЬНАГАРАДЗКІ ЗЬЛЁТ РАБСЕЛЬВАЕНКОРАЎ, ПРЫЗНАЧАНЫ НА 1-е ЛЮТАГА, АДКЛАДЗЕНЫ.**

**АБ ДНЮ СКЛІКАНЬНЯ ЗЬЛЁТУ БУДЗЕ АБВЕШЧАНА АСОБНА.**

**ПАРАДАК І МЕСЦА ЗЬЛЁТУ ЗАСТАЮЦЦА РАНЕЙШЫЯ.**

**Гарадзкі штаб паходу „За сацукла ну 2 пяцігодку“.**

## *АДЗІНЫ ПАРТДЗЕНЬ ПА ДРУКУ—22 ЛЮТАГА.*

**Пастановай ЦК КП(б)Б партдзень па пытаньнях друку, прызначаны на 25-е студзеня, пераносіцца на 22 лютага. Цэнтральнаму і мясцоваму друку прапанавана выкарыстаць застаўшыйся час для ўзмацненьня падрыхтоўчай работы да партдню аб друку.**

דער לעצטער פלענום פון שטאטישן פארטיי-קאמיטעט האט אנגענומען א ריי באשטימונגען וועגן דורכפירונג די לענינישע נאצפאליטיק אפ אונדזערע אונטערנעמונגען. די באשטימונגען דארפן זיין א שלאג-פראגראם אפ פארשטארקן די ווייסרוסי-זאציע, אינטערנאציאנאלע דערציונג פון די ארבעטער-מאסן, דאס באדינען די נאצמינדערהייטן אפ זייער מוטער-שפראך

**אין יעדער אונטערנעמונג דורכפירונג אינטערנאציאנאלע קאנפערענצן. זייערע באשלוסן פארוואנדלען אין קאנקרעטע מיסים, דערשלאגן זיך אן איבערבראך אין דער ארבעט**

## ניט אפשטעלן זיך אפ די איינצלנע דערגרייכונגען

אף דער נײַ-פאבריק „פראפינטערן" האבן מיר פאר דער לעצטער צייט אַ דיי דערגרייכונגען אין דער אינטערנאציאנאלער דערציונס ארבעט, אין זין פון קולטורעלער באדינונג די נאצמינדערהייטן אף זייער מוטער-שפראך, אין זין פון ארייננדרינגען פון ווייסרוסיזאציע.

די גאנצע טעכנישע ארבעט פון די ארגאניזאציעס איז אריבערגעפירט געוואָרן אף דער ווייסרוסישער שפראך.

אף דער פאבריק ארבעטן 45 פוילישע ארבעטער. מיט זיי ווערן דורכגעפירט באזונדער פארזאמלונגען אף זייער מוטער-שפראך. עס ארבעט אַ פוילישער ליקפונקט. עס ווערן אויסגעשריבן פוילישע צייטונגען „אָרקאַ"—23 עקז., „פאלישא ראדזעטשקאַ" 8 עקז.

אָבער עס איז נאָך ווייניק. דעם פוילישן ליקפונקט באזוכן אינגאנצן 5 מענטשן פון 11 אמעראצים.

זייער שוואך איז אויסגעשטעלט די ארבעט מיט די יידישע ארבעטער. צווישן די 630 יידישע ארבעטער, וואס ארבעטן אף דער פאבריק, זיינען פאראן א גרויסע צאָל אמעראצים און ס'איז ניט אָרגאנזירט קיין געוואָרן קיין איין ליקפונקט אין יידיש.

ס'איז פאראן א יידישער פאליטקרייז, אָבער אים באזוכן נאָר 19 מענטשן. יידישע צייטונגען שרייבט מען אויס אינגאנצן 25 עקזעמפליארן אף 630 ארבעטער. קיין אוזטנס ווערן ניט דורכגעפירט.

קיין אנטיראליגיעזע ארבעט ווערט קימאַט אפן פאבריק ניט געפירט. נאָר אין די אנטיראליגיעזע קאמפאניעס ווערן געפירט שמועסן. ניטא קיין אפיקאָרסים-קעמערל.

די ארבעט פון געזערד איז אויך ניט אויסגעשטעלט אף דער געהעריקער הויך. עמעס. די קאָנדראַל-ציפער פון פארשפרייטן די בילעטן פון געזערד-לאָטעריי איז אויסגעפילט. מע האָט פארשפרייט 3600 בילעטן. פאר דער לעצטער צייט האָט מען זיך גענומען אָרגאניזירן געזערד-קעמערלעך אין אלע צעכן. אָבער די ארבעט איז נאָך זייער א קליינע. עס זיינען ניט דורכגעפירט געוואָרן קיין איבערוואלן פון די קעמערלעך, וועלכע זיינען פריער געווען, אין דער צייט, ווען דאס וואלט געגעבן א מעגלעכקייט ברייט פאנאנדערוויקלען די ארבעט פון געזערד.

ס'איז אָרגאניזירט געוואָרן באם פאבריק א ביבליאָטעק, נאָר אין איר איז דערווייל א קליינע צאָל ביכער פאר די נאצמינדערהייטן: אינגאנצן 70 עקז. אף דער יידישער שפראך און עטלעכע פוילישע.

פאר דער לעצטער צייט זיינען דא צופאלן פון שאוויניסטישע און אנטיסעמיטישע ארויסטרעטונגען. דער ארבעטער שילקאָ האָט געזאגט אף א יידישן ארבעטער:

«Не имей жидовскую привычку».

די ארבעטערן סלעפטשאנאק וופס דעם ווייסרוסישן ארבעטער „מוזשיק":

די געזעלשאפטלעכקייט פון דער פאבריק האָט דעגאירט אף די פאקטן. מע האט באשטימט די ארבעטער סלעפטשאנאק און שילקא אראפנעמען פון דער ארבעט, אָבער די באשטימונג איז ניט אויסגעפילט אף אלע 100 פראצ.

די באשטימונג פון פארט-קאלעקטיוו וועגן נאצפאליטיק און ווייסרוסיזאציע ווערן ניט קאנסטרואירט ווי מען פילט זיי אויס.

